...етары ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 243 (312)
СУБОТА
19
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

ВЫБАРЧЫ ЗАКОН -- У МАСЫ!

Сёння ў нашай газеце друкуецца «Палажэнне аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР».

Выбарчы закон краіны Советаў, асновааны на прынцыпах соцыялістычнага дэмакратызма, зыходзячага з асноў Сталінскай Канстытуцыі, адзіна правільна забяспечвае праведзенне ў жыццё совецкага дэмакратычнага выбарчага права. Выбарчыя законы ў капіталістычных краінах з'яўляюцца такой сістэмай правіл, якая рознымі агаворкамі, тлумачэннямі і быццам чыста тэхнічнымі дэталямі, устараняе ад палітычнага жыцця, ад удзелу ў выбарах працоўных. Совецкі выбарчы закон не ведае ніякіх агаворак, ніякіх талкаванняў, тэхнічных дэталяў, якія-б абмяжоўвалі выбарчыя правы грамадзян, адстараняглі іх ад удзелу ў выбарах. Усеагульнасць, роўнасць, прамы характар выбараў і тайнасць галасавання забяспечваюцца як самой сутнасцю совецкага ладу, фактычнай гарантыяй роўнасці выбаршчыкаў, матэрыяльнай сілай — совецкім дзяржаўным апаратам, так і сістэмай юрыдычных правіл, якія вызначаюць парадак выбараў, увесь іх арганізацыйна-тэхнічны бок.

Артыкул 1-ы Палажэння гласіць: «На падставе артыкула 109 Канстытуцыі БССР выбары дэпутатаў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных праводзяцца выбаршчыкамі на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні». Усе грамадзяне, дасягнуўшыя 18-гадовага ўзросту, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, веравызнання, адукацыйнага цэнзу, аседласці, соцыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і мінулай дзейнасці, маюць права выбіраць і быць выбранымі ў Советы дэпутатаў працоўных за выключэннем страціўшых розум і асоб, асуджаных судом з пазбаўленнем выбарчых правоў.

Сталінскі выбарчы закон на справе забяспечвае народу фактычную магчымасць выбіраць сваіх прадстаўнікоў — людзей, якія карыстаюцца яго давер'ем, якія да канца адданы соцыялістычнай радзіме.

Артыкул 68 Палажэння ўстанаўлівае парадак выстаўлення кандыдатаў у дэпутаты. Права выстаўляць кандыдатаў у дэпутаты забяспечваецца за грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных: комуністычнымі партыйнымі арганізацыямі, прафесіянальнымі саюзамі, кааператывамі, арганізацыямі моладзі і іншымі, зарэгістрыраванымі ва ўстаноўленым законам парадку. Права вылучэння кандыдатаў ажыццяўляюць як цэнтральныя органы грамадскіх арганізацый, так і мясцовыя, а таксама сходы рабочых і служачых на прадпрыемствах і ўстановах, чырвонаармейцаў — па вайсковых часцях, сходы сялян у калгасах і вёсках.

Такі парадак вылучэння кандыдатаў забяспечвае поўны дэмакратызм і разам з тым дае магчымасць вылучыць кандыдатамі ў дэпутаты толькі перадавых людзей, стаханаўцаў прамысловых прадпрыемстваў, сельскай гаспадаркі і лепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

Наш народ—выбаршчыкі прад'яўляюць вялікія патрабаванні да дэпутатаў. Дэпутат совета павінен адпавядаць вялікім патрабаванням дзеячоў ленінска-сталінскага тыпу. Дэпутат — гэта слуга народа. Інтарэсы народа ў яго вышэй за ўсё. Чэснасць, прамата, адданасць сваёй соцыялістычнай радзіме, вялікім ідэям комунізма — вось характэрныя рысы, якімі павінен валодаць дэпутат — выбранік народа.

Сталінская Канстытуцыя і выбарчы закон прадугледжваюць права выбаршчыкаў адклікаць з Советаў непрыгодных дэпутатаў, якія перастаюць чэсна служыць народу, і замяняць іх другімі.

Асобнымі артыкуламі, 120 і 121, Палажэнне аб выбарах устанаўлівае адказнасць асоб за нарушэнне выбарчых правоў грамадзян. Ніякага прымусу, абману ці пагрозы з боку каго-б та ні было не можа быць. Асобы, якія прыбегнуць да нарушэння выбарчых правоў грамадзян, караюцца пазбаўленнем волі тэрмінам да двух год. Службовыя асобы Советаў ці членаў выбарчых камісій, зрабіўшыя падздзелку выбарчых дакументаў або свядома допусціўшыя няправільны падлік галасоў, — караюцца пазбаўленнем волі тэрмінам да трох год. Вялікія выбарчыя правы грамадзяніна Совецкай краіны, якія прадастаўлены яму Сталінскай Канстытуцыяй, ніхто не можа нарушыць.

Выбарчая кампанія ў нашай вобласці разгортваецца ўсё больш і больш. Грамадскія арганізацыі, сходы рабочых, сялян, інтэлігенцыі вылучаюць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі. Заканчваецца падзел населеных пунктаў, раёнаў і сельскіх советаў на выбарчыя акругі і ўчасткі.

У правядзенні выбарчай кампаніі прымае актыўны ўдзел насельніцтва. Толькі ў члены выбарчых акруговых і ўчастковых камісій вылучаецца звыш 45 тысяч чалавек. У актыўную работу ўключылася вялікая армія агітатараў, вылучаных партыйнымі арганізацыямі. На фабрыках і заводах, у калгасах, вёсках і дамах выбаршчыкаў цяпер вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю.

Пачатак выбарчай кампаніі выклікаў вялікі творчы ўздым сярод рабочых, сялян і інтэлігенцыі. Рабочыя калектывы, калгаснікі абавязуюцца датэрмінова выканаць стаячыя перад імі вялікія гаспадарчыя задачы.

Таму творчы ўздым і палітычная актыўнасць мас патрабуюць яшчэ большай работы партыйных арганізацый. Ні ў якім выпадку нельга пакладацца на самацёк. Патрэбна так паставіць работу, каб ні адзін выбаршчык не астаўся па-за нашай увагі. Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах трэба давесці да свядомасці кожнага грамадзяніна, выбаршчыка. Асабліва трэба растлумачыць правы выбаршчыкаў, парадак галасавання, значэнне саставлення спіскаў, вылучэнне кандыдатаў.

Насельніцтву трэба расказаць пра насілле, ашуканствы, якія прымяняюцца ў буржуазных краінах. Паказаць карэнную розніцу паміж мясцовымі самаўпраўленнямі капіталістычных краін і нашымі Советамі дэпутатаў працоўных; шырока азнаёміць выбаршчыкаў з дасягненнямі будаўніцтва новага жыцця ў нашай вобласці за год.

Трэба памятаць, што поспех выбарчай кампаніі залежыць ад нас саміх. Выбаршчыкі нашы — самыя актыўныя выбаршчыкі ў свеце.

Палажэнне аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя советы дэпутатаў працоўных — у масы!

Вылучаецца састаў выбарчых камісій

АЎГУСТОЎ. **(Па тэлефону).** У Аўгустоўскім раёне разгарнулася падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Працоўныя горада і раёна з вялікай радасцю сустрэлі Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку выбарчай кампаніі па выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных. На адбыўшымся агульнагарадскім мітынгу, прысвечаным пачатку выбарчай кампаніі, прысутнічала больш 3 тысяч чалавек. Праведзены мітынгі ў 9 калгасах і 13 сельсоветах раёна.

17 кастрычніка адбылася нарада старшынь і сакратароў сельсоветаў па пытанню аб арганізацыі акруг і складанні спіскаў.

Па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных створана 41 акруга. Вылучаецца састаў выбарчых камісій па выбарах у абласны, гарадскі, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных.

Самых лепшых, самых чэсных і адданых людзей — патрыётаў соцыялістычнай радзімы пашлём у выбарчыя камісіі!

У САСТАЎ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ---ЛЕПШЫХ ЛЮДЗЕЙ

КНЫШЫН. **(Ад нашага карэспандэнта).** У вёсках Монькаўскага раёна з кожным днём усё шырэй разгортваецца выбарчая кампанія. Усюды з вялікім уздымам праходзяць сходы выбаршчыкаў. У раённым цэнтры—Кнышыне пры высокай актыўнасці выбаршчыкаў прайшлі сходы рабочых і служачых, на якіх намечаны кандыдаты ў састаў раённай выбарчай камісіі па выбарах у раённы Совет. У склад раённай камісіі аднадушна вылучаны лепшыя, праверaныя людзі.

Комсамольцы раёна добра ведаюць выхаванку комсамола, дэпутата Вярхоўнага Совета БССР Юзэфу Каханскую. Вылучаючы яе ў састаў раённай выбарчай камісіі, яны ўпэўнены, што іх давер'е тав. Каханская з чэсцю апраўдае.

Дружна прайшоў сход членаў сельскагаспадарчай арцелі «Першага мая». Калгаснікі аднадушна намецілі ў састаў раённай выбарчай камісіі лепшую калгасніцу-стаханаўку Софію Кабешка.

На агульназаводскім сходзе рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі скурзавода вылучылі ў састаў раённай выбарчай камісіі майстра-стаханаўца Бейло. На сходзе членаў саюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ вылучана ў камісію маладая настаўніца Ніна Пятруша.

В. Гарбанёў.

Прадстаўнік 1 камбіната ў гарадскую выбарчую камісію

З усіх цэхаў сходзяцца рабочыя першай змены 1-га тэкстыльнага камбіната ў ленінскі куток на сход, прысвечаны вылучэнню прадстаўніка ў гарадскую выбарчую камісію.

Сход адкрыла сакратар партарганізацыі тав. Матвеева.

Майстар-прадзільшчык тав. Неплашчук рэкамендуе вылучыць у гарадскую выбарчую камісію лепшую стаханаўку прадзільнага цэха Сцефаніду Васільеўну Жыўлюк.

— Я ведаю тав. Жыўлюк па сумеснай рабоце тры годы, — кажа тав. Неплашчук.—Яна дачка селяніна-бедняка, сама доўгі час служыла ў пана Гданскага. У 1930 годзе яна пайшла працаваць на фабрыку. Апошні час зноў служыла ў пана. За час работы на камбінаце пры совецкай уладзе тав. Жыўлюк праявіла сябе як лепшая стаханаўка, як майстар прадзільнай справы, яна прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце.

Кандыдатуру тав. Жыўлюк падтрымалі выступіўшыя тт. Баршчэўская, Дзіновіч і іншыя.

— Тав. Жыўлюк,—гаворыць тав. Баршчэўская,—з'яўляецца першай стаханаўкай на нашым камбінаце, выконвае норму на 130—140 процантаў. Яна з'яўляецца старшынёй цэхкома, членам камісіі па зарплаце. Я лічу, што яна дастойна вылучэння нашым прадстаўніком у гарадскую выбарчую камісію і апраўдае наша давер'е.

240 чалавек рабочых, прысутнічаўшых на сходзе, аднадушна галасавалі за стаханаўку і актывістку тав. Жыўлюк.

Р. Кісельман.

Знатныя людзі вобласці вылучаны ў абласную выбарчую камісію

ЛОМЖА. **(Па тэлефону).** Сход рабочых ломжынскага цагельнага завода № 4 аднагалосна вылучыў у састаў абласной камісіі па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных дэпутата Вярхоўнага Совета СССР тав. І. А. Турлейскага.

* * *

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Сталіна, Заблудаўскага раёна, на агульным сходзе аднадушна вылучылі прадстаўніком у абласную выбарчую камісію старшыню сваёй сельгасарцелі дэпутата Вярхоўнага Совета БССР тав. Еўдакію Максімюк.

На сходзе з прамовай выступіў калгаснік Іосіф Дзмітрыевіч Новік. Ён ахарактарызаваў тав. Максімюк, як адданую, чэсную грамадзянку нашай радзімы. Тав. Максімюк умела спалучае выкананне вялікіх абавязкаў дэпутата Вярхоўнага Совета з абавязкамі старшыні калгаса.

* * *

Ад совецкіх пісьменнікаў Беластока ў абласную выбарчую камісію вылучан дэпутат Вярхоўнага Совета СССР вядомы паэт Філіп Сямёнавіч Пестрак.

Чыгуначнікі Беластоцкага вузла паслалі ў абласную выбарчую камісію памочніка машыніста станцыі Беласток стаханаўца Л. І. Партынскага.

Ад абласной арганізацыі МОПР'а вылучана ў састаў абласной выбарчай камісіі старшыня абкома МОПР тав. Рэгіна Каплан—Софія Львоўна Цэнтры.

ЗАКОНЧЫЛІ АРГАНІЗАЦЫЮ ВЫБАРЧЫХ АКРУГ І ЎЧАСТКАЎ

ПАРЭЧЧА. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** У Парэцкім раёне дзейна рыхтуюцца да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Ужо закончана работа па арганізацыі выбарчых акруг і ўчасткаў. У раёне створана адна акруга па выбарах у абласны Совет, 25 акруг—у раённы Совет і 220 акруг—у сельсоветы.

Падрыхтаваны таксама памяшканні для 25 выбарчых участкаў. 25 агіткалектываў энергічна праводзяць работу сярод насельніцтва.

Райком партыі намеціў правесці раённую нараду кіраўнікоў агіткалектываў па пытанню аб задачах агітатараў у сувязі з выбарчай кампаніяй. Днямі адбудзецца раённы сход інтэлігенцыі, на якім будзе зроблен даклад аб ролі совецкай інтэлігенцыі ў надыходзячых выбарах. На выбарчых участках намечана прачытаць рад лекцый на польскай і літоўскай мовах.

Пры парткабінеце арганізоўваецца спецыяльная выстаўка, прысвечаная выбарам у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Асобны раздзел выстаўкі адлюструе выбары ў былой панскай Польшчы і ў буржуазных краінах.

Ўсе грамадскія арганізацыі і таварыствы раёна вылучылі сваіх прадстаўнікоў у абласную акруговую камісію па выбарах у абласны Совет.

Г. Лупсякоў.

Пастанова Беластоцкага абласнога выканаўчага камітэта

АБ УТВАРЭННІ ВЫБАРЧЫХ АКРУГ ПА ВЫБАРАХ У АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ БЕЛАСТОЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

На аснове Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 12 кастрычніка 1940 года і арт. 25 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР», Беластоцкі абласны выканаўчы камітэт **пастанаўляе:**

утварыць наступныя выбарчыя акругі па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных Беластоцкай вобласці:

ПА ГОРАДУ БЕЛАСТОКУ

Беластоцкая Ленінская выбарчая акруга № 1 з цэнтрам у горадзе Беластоку ў межах: ад лесапільнага завода, па паўднёва-заходняму шасе, па праваму баку чыгункі на Баранавічы да Фізкультурнай вуліцы, пераходзячы на левы бок палатна чыгункі і ўключаючы Фізкультурную вуліцу да вуліцы Крупскай; уключаючы частку вуліцы Крупскай да вуліцы Горкага, уключаючы вуліцу Горкага, даходзіць да вуліцы Кірава, уключаючы Стары рынак, даходзіць да вул. Чырвонаармейскай і Агароднай, уключаючы вул. Агародную да перасячэння вуліцы Пяцігорскай і Ленінскай, уключаючы вул. Ленінскую да палатна чыгункі. Далей па леваму баку палатна чыгункі да вул. Гомельскай, далей у канец вуліцы Осавецкай да ракі Белай, па рацэ Белай да вуліцы Сакольскай і па калоніі Беласточак 2-гі.

Беластоцкая Чырвонаармейская выбарчая акруга № 2 з цэнтрам у горадзе Беластоку ў межах: ад паўднёва-заходняга шасе і былога маёнтка Крыляны да перасячэння паўднёва-заходняга шасе і па вул. Міцкевіча, уключаючы вул. Міцкевіча да вул. Соцыялістычнай, да ракі Белай і далей уверх па рацэ Белай і паварачвае па рацэ Далістоўка да перасячэння вуліц Чырвонаармейскай і Акопнай, уключаючы вул. Чырвонаармейскую, Чкалава, Стары рынак, Горкага і ад перасячэння вул. Горкага з вул. Крупскай да вул. Фізкультурнай, уключаючы Фізкультурную, да палатна чыгункі на Баранавічы і левага боку палатна да лесапільнага завода па Паўднёва-Заходняму шасе.

Беластоцкая Фабрычная выбарчая акруга № 3 з цэнтрам у горадзе Беластоку ў межах: ад перасячэння вул. Совецкай з вул. Свердлова да вул. Беластачанскай, уключаючы вул. Беластачанскую і Палявую, і па перасячэнню вул. Жытняй з вул. Чыстай, уключаючы вул. Чыстую да вул. Палескай, і да ракі Белай і вышэй ракі Белай, уключаючы вул. Осавецкую.

Далей ад перасячэння вул. Гомельскай з палатном чыгункі на Баранавічы і ідзе правым бокам палатна чыгункі да вул. Ленінскай і да перасячэння вул. Ленінскай з вул. Пяцігорскай. З гэтага месца, уключаючы вул. Ленінскую да Совецкай, да вул. Свердлова, да першапачатковага пункта.

Беластоцкая Совецкая выбарчая акруга № 4 з цэнтрам у горадзе Беластоку ў межах: ад перасячэння вул. Совецкай з вул. Ленінскай, уключаючы Ленінскую вул. да перасячэння з вул. Чырвонаармейскай, уключаючы яе па вул. Акопнай і да ракі Далістоўкі, уніз па рацэ Белай, не даходзячы да вул. Ожэшка, да перасячэння вул. Соцыялістычнай з вул. Міцкевіча. Уключае вул. Міцкевіча, Падлесную, Тіміразева, Рыбны рынак, Мядовую да вул. Авіяцыйнай і перасякае вул. Папанінскую да вул. Совецкай, паварачвае з Ленінскай, уключае вул. Совецкую да першапачатковага пункта.

Беластоцкая Цэнтральная выбарчая акруга № 5 з цэнтрам у горадзе Беластоку ў межах: ад злучэння вуліц Чапаеўскай з вул. Совецкай, уключае апошнюю да перасячэння вул. Совецкай з вул. Папанінскай, уключаючы вул. Папанінскую і вул. Авіяцыйную да вул. Дубовай, уключаючы вул. Дубовую і Супраслеўскую да перасячэння вул. Садовай з вул. Сухой. Уключыўшы частку вул. Сухой і поўнасцю вул. Трактарную ідзе па вул. Млыновай. Уключыўшы частку вул. Млыновай і поўнасцю вул. Плеханава да вул. Урыцкага і ўключае яе да перасячэння вул. Сасновай з вул. Суконнай і ўключае Суконную да перасячэння яе з вул. Кастрычніцкай да першапачатковага пункта.

Беластоцкая Слабодская выбарчая акруга № 6 з цэнтрам у горадзе Беластоку ў межах: ад перасячэння паўднёва-заходняга шасе з вул. Вясенняй, не ўключаючы яе, і без вул. Сельскай, да вул. Мазавецкай з паўднёвага шасе паварачвае к вул. Астравецкай. Уключыўшы Астравецкую вул., ідзе да перасячэння вул. Плеханава з вул. Комсамольскай і ўключаючы частку Комсамольскай вул. зноў паварачвае да паўднёвага шасе і ўключае вул. Віцебскую і да перасячэння вул. Віцебскай з вул. Млыновай. З гэтага месца мяжа ўключае вул. Млыновую і вул. Апанскага да перасячэння апошняй з вул. Плеханава і часткова ўключае яе да вул. Млыновай. Далей ідзе па паўднёвай мяжы Цэнтральнай акругі, паўднёва-заходняй мяжы Совецкай акругі і заходняй мяжой Чырвонаармейскай акругі, даходзячы да вуліцы Крыўляны.

Беластоцкая Чыгуначная выбарчая акруга № 7 з цэнтрам у горадзе Беластоку ў межах: з прадмесця Высокі Сточак і па леваму баку шасе да Рамесленай вуліцы, уключаючы Жаўткоўскае шасе і частку Кастрычніцкай вуліцы да перасячэння з раней указанымі межамі Цэнтральнай і Слабодскай акруг, выходзячы на паўднёва-заходняе шасе, дзе і заканчвае свае межы.

Беластоцкая Першамайская выбарчая акруга № 8 з цэнтрам у горадзе Беластоку ў межах: ад былой калоніі Беласточак 1-ы, гэта значыць, з паўночна-заходняй мяжы Ленінскай акругі, і супадае з мяжой Фабрычнай акругі, далей супадае з часткай Паўночнай мяжы Цэнтральнай акругі і поўнасцю з паўночнай мяжой Чыгуначнай выбарчай акругі і заканчваецца на прадмесці Высокі Сточак.

ПА ГОРАДУ ГРОДНА

Гродненская Паўночна-Заходняя выбарчая акруга № 9 з цэнтрам у горадзе Гродна, у межах: ад пляжа па праваму берагу ракі Нёман па вул. Рыбацкай да ракі Гараднічанкі.

Па праваму берагу ракі Гараднічанкі і далей па прытоку гэтай ракі да маста на вуліцы Горкага, з паваротам на вул. Дзержынскага, уключаючы плошчу Леніна, па вул. Дзержынскага да Стрыхарскай вуліцы і далей на паўночны захад (уздоўж вул. Стрыхарскай) да мяжы горада.

Гродненская Паўночна-Ўсходняя выбарчая акруга № 10 з цэнтрам у горадзе Гродна, у межах: ад граніцы горада, уключаючы тэрыторыю цагельных заводаў і вул. Стрыхарскую, і вуліцы Дзержынскага і Соцыялістычнай да вул. Кіраўскай, па вул. Кіраўскай да палатна чыгункі, далей на поўнач да палатна чыгункі, да тэрыторыі ізразцовага завода, камбінат № 1 і далей ва ўсходнім напрамку да мяжы горада.

Гродненская Цэнтральная выбарчая акруга № 11 з цэнтрам у горадзе Гродна, у межах: ад ракі Нёман, левым берагам ракі Гараднічанка і яе прытока да маста па вул. Горкага, уключаючы плошчу Леніна.

Ад вул. Дзержынскага па вул. Соцыялістычнай да Кіраўскай, па вул. Кіраўскай да вул. Пасіянарыі, па вул. Пасіянарыі, Совецкай плошчы, Крупскай і Маставой да ракі Нёман.

Гродненская Ўсходняя выбарчая акруга № 12 з цэнтрам у горадзе Гродне, у межах: ад гарадской мяжы да правага берагу ракі Нёман, да палатна чыгункі; уздоўж палатна чыгункі да вул. Свердлова, уздоўж вул. Свердлова да Комсамольскай; уздоўж вул. Комсамольскай да вул. Парыжскай Комуны і ўздоўж вул. Парыжскай Комуны і Беднарскай да вул. Крупскай; па вул. Крупскай да вул. Кіраўскай, па вул. Кіраўскай да палатна чыгункі; уздоўж палатна чыгункі да тэрыторыі ізразцовага завода і далей на ўсход да гарадской мяжы.

Гродненская Занёманская Паўднёва-заходняя выбарчая акруга № 13 з цэнтрам у горадзе Гродна, у межах: ад яўрэйскіх могілак па леваму берагу ракі Нёман да вул. Грыгорыя Горкавых, Грахоўскай, Беластоцкай да гарадской мяжы.

Гродненская Занёманская Паўднёва-ўсходняя выбарчая акруга № 14 з цэнтрам у горадзе Гродна, у межах: ад мяжы горада па вул. Бела-

(Працяг на 4 стар.).

Зацверджана II Сесіяй Вярхоўнага Совета БССР, а таксама ўнесены змяненні і дапаўненні, прынятыя IV Сесіяй Вярхоўнага Совета БССР.

Палажэнне аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР

Раздзел I

Выбарчая сістэма

Артыкул 1. На падставе артыкула 109 Канстытуцыі БССР выбары дэпутатаў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных праводзяцца выбаршчыкамі на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Артыкул 2. На падставе артыкула 110 Канстытуцыі БССР выбары дэпутатаў з'яўляюцца ўсеагульнымі: усе грамадзяне БССР, дасягнуўшыя 18 год, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, веравызнання, адукацыйнага цэнза, аседласці, сацыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і ранейшай дзейнасці, маюць права ўдзельнічаць у выбарах дэпутатаў і быць выбранымі ў Советы дэпутатаў працоўных за выключэннем страціўшых розум і асоб, асуджаных судом з пазбаўленнем выбарчых правоў.

Артыкул 3. На падставе артыкула 111 Канстытуцыі БССР выбары дэпутатаў з'яўляюцца роўнымі: кожны грамадзянін мае адзін голас; усе грамадзяне ўдзельнічаюць у выбарах на роўных падставах.

Артыкул 4. На падставе артыкула 112 Канстытуцыі БССР жанчыны карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі нароўні з мужчынамі.

Артыкул 5. На падставе артыкула 113 Канстытуцыі БССР грамадзяне, якія знаходзяцца ў радах Чырвонай Арміі, карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі нароўні з усімі грамадзянамі.

Артыкул 6. На падставе артыкула 114 Канстытуцыі БССР выбары дэпутатаў з'яўляюцца прамымі: выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных праводзяцца выбаршчыкамі непасрэдна шляхам прамых выбараў.

Артыкул 7. На падставе артыкула 115 Канстытуцыі БССР галасаванне пры выбарах дэпутатаў у Советы дэпутатаў працоўных БССР з'яўляецца тайным.

Артыкул 8. На падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР выбары ў Советы дэпутатаў працоўных БССР праводзяцца па выбарчых акругах.

Кожная выбарчая акруга пасылае ў адпаведны Совет дэпутатаў працоўных аднаго дэпутата.

Артыкул 9. На падставе артыкула 18 Канстытуцыі БССР грамадзяне ўсіх іншых саюзных рэспублік карыстаюцца на тэрыторыі БССР выбарчымі правамі нароўні з грамадзянамі БССР.

Артыкул 10. Расходы, звязаныя з правядзеннем выбараў у Советы дэпутатаў працоўных БССР, робяцца за кошт дзяржавы.

Раздзел II

Спісы выбаршчыкаў

Артыкул 11. Спісы выбаршчыкаў складаюцца ў гарадах гарадскім Советам дэпутатаў працоўных, а ў гарадах з раённым падзелам — раённым Советам; у сельскіх мясцовасцях — сельскім Советам; у пасёлках—пасялковым Советам дэпутатаў працоўных. Форма спісаў выбаршчыкаў устанаўліваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР.

Артыкул 12. У спісы выбаршчыкаў уключаюцца ўсе грамадзяне, якія маюць выбарчае права і пражываюць (пастаянна або часова) к моманту складання спісаў на тэрыторыі данага Совета, дасягнуўшыя к дню выбараў 18 год.

Артыкул 13. Не ўносяцца ў спісы выбаршчыкаў асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў па судовых прыгаворах на працягу ўсяго ўстаноўленага ў прыгаворы тэрміну пазбаўлення выбарчых правоў, а таксама асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку страціўшымі розум.

Артыкул 14. Ніхто з выбаршчыкаў не можа быць унесен больш, чым у адзін выбарчы спіс.

Артыкул 15. Спісы выбаршчыкаў—агульныя для выбараў ва ўсе Советы дэпутатаў працоўных — складаюцца па кожнаму выбарчаму ўчастку ў алфавітным парадку з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, узросту, месца жыхарства выбаршчыка, а таксама нумароў выбарчых акруг па выбарах у адпаведны Совет дэпутатаў працоўных. Спісы выбаршчыкаў падпісваюцца старшынёю і сакратаром Совета дэпутатаў працоўных.

Артыкул 16. Спісы выбаршчыкаў, якія знаходзяцца ў воінскіх часцях і вайсковых злучэннях, складаюцца камандаваннем за подпісамі камандзіра і ваеннага камісара. Усе іншыя ваеннаслужачыя ўносяцца ў спісы выбаршчыкаў па месцу жыхарства адпаведнымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Артыкул 17. Спісы выбаршчыкаў выбарчых участкаў, ствараемых пры больніцах, радзільных дамах, санаторыях і іншых лячэбных установах, складаюцца як на хворых грамадзян, так і на медыцынскі персанал, які знаходзіцца на дзяжурстве ў дзень выбараў.

У выбарах не могуць прымаць удзел хворыя, якія знаходзяцца ў скарлатынозных і дыфтэрыйных аддзяленнях.

Артыкул 18. За 35 дзён да выбараў Совет дэпутатаў працоўных вывешвае спісы выбаршчыкаў для ўсеагульнага агляду або забяспечвае выбаршчыкам магчымасць азнаямляцца з гэтымі спісамі ў памяшканні Совета.

Артыкул 19. Арыгінал спісаў выбаршчыкаў захоўваецца адпаведна ў Совеце дэпутатаў працоўных і ў воінскай часці або вайсковым злучэнні.

Артыкул 20. Пры перамене выбаршчыкам месца свайго прабывання ў тэрмін паміж апублікаваннем спіса выбаршчыкаў і днём выбараў адпаведны Совет дэпутатаў працоўных выдае яму па форме, устаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР, «пасведчанне на права галасавання» і адзначае ў спісе выбаршчыкаў — «выбыў»; у пункце новага месцажыхарства — пастаяннага або часовага — выбаршчык уносіцца ў спіс выбаршчыкаў пры прад'яўленні пасведчання асобы, а таксама «пасведчання на права галасавання».

Артыкул 21. Заява аб няправільнасці ў спісе выбаршчыкаў (неўключэнне ў спіс, выключэнне са спіса, скажэнне прозвішча, імя, імя па бацьку, няправільнае ўключэнне ў спіс асоб, пазбаўленых выбарчых правоў) падаецца ў Совет дэпутатаў працоўных, які апублікаваў спіс.

Артыкул 22. Выканаўчы камітэт Совета дэпутатаў працоўных абавязан разгледзець кожную заяву аб няправільнасці ў спісе выбаршчыкаў у трохдзённы тэрмін.

Артыкул 23. Пасля разгляду заявы аб няправільнасці ў спісе выбаршчыкаў, Выканаўчы камітэт Совета дэпутатаў працоўных абавязан або ўнесці неабходныя выпраўленні ў спіс выбаршчыкаў, або выдаць заявіцелю пісьмовую даведку аб матывах адхілення яго заявы; пры нязгодзе з рашэннем Совета дэпутатаў працоўных заявіцель можа падаць скаргу ў Народны суд.

Артыкул 24. Народны суд на працягу трох дзён абавязан у адкрытым судовым пасяджэнні з выклікам заявіцеля і прадстаўніка Совета разгледзець скаргу на няправільнасць у спісе і сваё рашэнне неадкладна паведаміць як заявіцелю, так і Совету. Рашэнне Народнага суда канчатковае.

Раздзел III

Выбарчыя акругі і выбарчыя камісіі па выбарах у абласныя Советы дэпутатаў працоўных

Артыкул 25. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у абласныя Советы дэпутатаў працоўных праводзіцца абласнымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Выбарчыя акругі на падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР па выбарах у абласныя Советы дэпутатаў працоўных утвараюцца па наступных нормах:

Мінская	вобласць	адна	акруга	на 15.000	чалавек	насельніцтва
Беластоцкая	»	»	»	» 15.000	»	»
Віцебская	»	»	»	» 15.000	»	»
Магілеўская	»	»	»	» 15.000	»	»
Баранавіцкая	»	»	»	» 15.000	»	»
Гомельская	»	»	»	» 12.000	»	»
Вілейская	»	»	»	» 12.000	»	»
Брэсцкая	»	»	»	» 12.000	»	»
Палеская	»	»	»	» 11.000	»	»
Пінская	»	»	»	» 10.000	»	»

Артыкул 26. Спісы выбарчых акруг па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца выканаўчым камітэтам абласнога Совета дэпутатаў працоўных не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

Артыкул 27. У кожнай вобласці ўтвараецца Абласная выбарчая камісія па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

Артыкул 28. Абласныя выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 8—10 членаў не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

Артыкул 29. Абласная выбарчая камісія:

а) наглядае на ўсёй тэрыторыі вобласці за няўхільным выкананнем у ходзе выбараў у абласны Совет дэпутатаў працоўных гэтага Палажэння аб выбарах;

б) разглядае скаргі на няправільныя дзеянні выбарчых камісій і выносіць па скаргах канчатковыя рашэнні;

в) выпускае выбарчыя бюлетэні па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных;

г) рэгіструе выбраных дэпутатаў у абласны Совет дэпутатаў працоўных;

д) здае мандатнай камісіі абласнога Совета дэпутатаў працоўных справаводства па выбарах.

Артыкул 30. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных ствараецца Акруговая выбарчая камісія.

Артыкул 31. Акруговыя па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца выканаўчым камітэтам абласнога Совета дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 4—6 членаў не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

Артыкул 32. Акруговая па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія:

а) устанаўлівае парадкавыя нумары выбарчых участкаў;

б) рэгіструе выстаўленых з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб выбарах кандыдатаў у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных;

в) снабжае Участковыя выбарчыя камісіі выбарчымі бюлетэнямі па ўстаноўленай форме;

г) устанаўлівае рэзультаты выбараў па акрузе;

д) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні;

е) прадстаўляе ў Абласную выбарчую камісію справаводства па выбарах.

Раздзел IV

Выбарчыя акругі і выбарчыя камісіі па выбарах у раённыя Советы дэпутатаў працоўных

Артыкул 33. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у раённыя Советы дэпутатаў працоўных праводзіцца раённымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Выбарчыя акругі на падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР утвараюцца па наступных нормах:

у раёне з насельніцтвам звыш 25 тысяч чалавек — адна выбарчая акруга на кожныя 1.000 чалавек насельніцтва, аднак, не больш 60 акруг;

у раёне з насельніцтвам да 25 тысяч чалавек утвараецца 25 выбарчых акруг.

Артыкул 34. Спісы выбарчых акруг па выбарах у раённыя Советы дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца выканаўчымі камітэтамі раённых Советаў дэпутатаў працоўных не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

Артыкул 35. У кожным раёне ствараецца Раённая выбарчая камісія па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных.

Артыкул 36. Раённыя выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца выканаўчымі камітэтамі абласных Советаў дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 4—6 членаў не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

Артыкул 37. Раённая выбарчая камісія:

а) наглядае на тэрыторыі раёна за няўхільным выкананнем у ходзе выбараў у раённы Совет гэтага Палажэння аб выбарах;

б) разглядае скаргі на няправільныя дзеянні выбарчых камісій па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных;

в) наглядае за своечасовым складаннем і давядзеннем да ўсеагульнага ведама спісаў выбаршчыкаў;

г) наглядае за своечасовай арганізацыяй выбарчых участкаў адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі Советаў дэпутатаў працоўных;

д) выпускае выбарчыя бюлетэні па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных;

е) рэгіструе выбраных дэпутатаў у раённы Совет дэпутатаў працоўных;

ж) здае мандатнай камісіі раённага Совета дэпутатаў працоўных справаводства па выбарах.

Артыкул 38. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных ствараецца Акруговая выбарчая камісія.

Артыкул 39. Акруговыя па выбарах у раённыя Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца выканаўчым камітэтам раённага Совета дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 2—4 членаў не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

Артыкул 40. Акруговая па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія:

а) рэгіструе выстаўленых з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб выбарах кандыдатаў у дэпутаты раённага Совета дэпутатаў працоўных;

б) снабжае Участковыя выбарчыя камісіі выбарчымі бюлетэнямі па ўстаноўленай форме;

в) устанаўлівае рэзультаты выбараў па акрузе;

г) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні;

д) прадстаўляе ў раённую выбарчую камісію справаводства па выбарах.

Раздзел V

Выбарчыя акругі і выбарчыя камісіі па выбарах у гарадскія, раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных

Артыкул 41. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у гарадскія і раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных праводзіцца адпаведна гарадскім, раённым у гарадах Советам дэпутатаў працоўных.

Выбарчыя акругі на падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР утвараюцца па наступных нормах:

у гарадах з насельніцтвам ад 12 тысяч да 100 тысяч чалавек — адна выбарчая акруга на кожныя 350 чалавек насельніцтва; у гарадах з насельніцтвам да 12 тысяч чалавек утвараецца 35 выбарчых акруг;

У гарадах Гомелі і Магілеве — адна выбарчая акруга на кожныя 400 чалавек насельніцтва;

у гарадах Беластоку і Віцебску— адна выбарчая акруга на кожныя 500 чалавек насельніцтва;

у горадзе Мінску — адна выбарчая акруга на кожныя 600 чалавек насельніцтва.

У гарадскіх раёнах з насельніцтвам звыш 20 тысяч чалавек утвараецца адна выбарчая акруга на кожныя 500 чалавек насельніцтва, аднак, не больш 250 выбарчых акруг; у гарадскіх раёнах з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек утвараецца 35 выбарчых акруг.

Артыкул 42. Спісы выбарчых акруг па выбарах у гарадскія і раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца выканаўчым камітэтам гарадскога, раённага ў гарадах Совета дэпутатаў працоўных не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

Артыкул 43. У кожным горадзе і раёне ў гарадах ствараецца Гарадская, Раённая выбарчая камісія па выбарах у гарадскі, раённы ў гарадах Совет дэпутатаў працоўных.

Артыкул 44. Гарадскія і Раённыя ў гарадах выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца: Гарадская выбарчая камісія ў гарадах абласнога падпарадкавання — абласным Советам дэпутатаў працоўных, у гарадах раённага падпарадкавання— раённым Советам дэпутатаў працоўных; Раённая выбарчая камісія ў гарадах — гарадскім Советам дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 6—10 членаў не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

Артыкул 45. Гарадская, Раённая ў гарадах выбарчая камісія:

а) наглядае на тэрыторыі горада і раёна за няўхільным выкананнем у ходзе выбараў у гарадскі, раённы Совет гэтага Палажэння аб выбарах;

б) разглядае скаргі на няправільныя дзеянні выбарчых камісій па выбарах у гарадскі, раённы ў гарадах Совет дэпутатаў працоўных;

в) наглядае за своечасовым складаннем і давядзеннем да ўсеагульнага ведама спісаў выбаршчыкаў;

г) наглядае за своечасовай арганізацыяй выбарчых участкаў адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі Советаў дэпутатаў працоўных;

д) выпускае выбарчыя бюлетэні па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па выбарах у гарадскі, раённы ў гарадах Совет дэпутатаў працоўных;

е) рэгіструе выбраных дэпутатаў у гарадскі, раённы ў горадзе Совет дэпутатаў працоўных;

ж) здае мандатнай камісіі гарадскога, раённага ў гарадах Совета дэпутатаў працоўных справаводства па выбарах.

Артыкул 46. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у гарадскі, раённы ў горадзе Совет дэпутатаў працоўных ствараецца Акруговая выбарчая камісія.

Артыкул 47. Акруговыя па выбарах у гарадскія, раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца выканаўчым камітэтам гарадскога, раённага ў горадзе Совета дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 2—4 членаў не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

Артыкул 48. Акруговая па выбарах у гарадскі, раённы ў горадзе Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія:

а) рэгіструе выстаўленых з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб выбарах кандыдатаў у дэпутаты гарадскога, раённага ў горадзе Совета дэпутатаў працоўных;

б) снабжае Участковыя выбарчыя камісіі выбарчымі бюлетэнямі па ўстаноўленай форме;

в) устанаўлівае рэзультаты выбараў па акрузе;

г) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні;

д) прадстаўляе ў Гарадскую, Раённую ў горадзе выбарчую камісію справаводства па выбарах.

Раздзел VI

Выбарчыя акругі і выбарчыя камісіі па выбарах у сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных

Артыкул 49. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных праводзіцца сельскімі і пасялковымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Выбарчыя акругі на падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР утвараюцца па наступных нормах:

на тэрыторыі сельскіх Советаў і пасёлкаў з насельніцтвам звыш 1000 чалавек — адна выбарчая акруга на кожныя 100 чалавек насельніцтва, аднак, не больш 25 акруг; у сельсоветах і пасёлках з насельніцтвам да 1000 чалавек утвараецца 9 выбарчых акруг.

Артыкул 50. Спісы выбарчых акруг па выбарах у сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца выканаўчымі камітэтамі сельскіх і пасялковых Советаў дэпутатаў працоўных не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

Артыкул 51. У кожным сельсовеце і пасёлку ствараецца Сельская, Пасялковая выбарчая камісія па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных.

Артыкул 52. Сельскія і Пасялковыя выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца раённымі Советамі дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 2—4 членаў не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

Артыкул 53. Сельская, Пасялковая выбарчая камісія:

а) наглядае на тэрыторыі сельсовета і пасёлка за няўхільным выкананнем у ходзе выбараў у сельскі, пасялковы Совет гэтага Палажэння аб выбарах;

б) разглядае скаргі на няправільныя дзеянні выбарчых камісій па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных;

в) выпускае выбарчыя бюлетэні па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных і снабжае выбарчымі бюлетэнямі ўчастковыя выбарчыя камісіі;

г) рэгіструе выбраных дэпутатаў у сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных;

д) здае мандатнай камісіі сельскага, пасялковага Совета дэпутатаў працоўных справаводства па выбарах.

Артыкул 54. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных ствараецца Акруговая па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія.

Артыкул 55. Акруговыя па выбарах у сельскія, пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца сельскім, пасялковым Советам дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, сакратара і аднаго члена камісіі не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

Артыкул 56. Акруговая па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія:

а) рэгіструе выстаўленых з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб

(працяг на 3 стар.).

Палажэнне аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР

(Працяг. Пачатак на 2 стар).

выбарах кандыдатаў у дэпутаты сельскага, пасялковага Совета дэпутатаў працоўных;

б) устанаўлівае рэзультаты выбараў па акрузе;

в) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні;

г) прадстаўляе ў Сельскую, Пасялковую выбарчую камісію справаводства па выбарах.

Раздзел VII
Выбарчыя ўчасткі і ўчастковыя выбарчыя камісіі

Артыкул 57. Для прыёму выбарчых бюлетэняў і падліку галасоў тэрыторыя гарадоў, пасёлкаў і сельсоветаў падзяляецца на выбарчыя ўчасткі, агульныя для выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных.

Артыкул 58. Утварэнне выбарчых участкаў праводзіцца ў гарадах гарадскімі Советамі дэпутатаў працоўных, у гарадах з раённым падзелам—раённымі Советамі дэпутатаў працоўных; у сельскіх мясцовасцях і пасёлках — раённымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Артыкул 59. Утварэнне выбарчых участкаў праводзіцца не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

Артыкул 60. Тэрыторыя сельсовета, які налічвае не больш 2.000 чалавек насельніцтва, складае, як правіла, адзін выбарчы ўчастак; у кожным сяле, вёсцы і пасёлку, які налічвае ад 500, але не больш 2.000 чалавек насельніцтва, арганізуецца асобны выбарчы ўчастак.

Тэрыторыя сельсовета і сельскага населенага пункта з насельніцтвам больш 2.000 чалавек падзяляецца на выбарчыя ўчасткі з разліку адзін выбарчы ўчастак на 1.500 — 2.500 чалавек насельніцтва.

У паселішчах або групе паселішч з насельніцтвам менш 500 чалавек, але не ніжэй 300 чалавек, у тых выпадках, калі адлегласць такіх паселішчаў да цэнтра выбарчага ўчастка перавышае 10 кілометраў, могуць быць утвораны асобныя выбарчыя ўчасткі.

У асобных раёнах Пінскай і Палескай абласцей, дзе пераважаюць дробныя паселішчы, выбарчыя ўчасткі могуць быць утвораны з насельніцтвам менш 300 чалавек, аднак, не ніжэй 100 чалавек.

Артыкул 61. Гарады і пасёлкі, якія налічваюць больш 2.000 чалавек насельніцтва, падзяляюцца на выбарчыя ўчасткі з разліку адзін выбарчы ўчастак на 1,500—2.500 чалавек насельніцтва.

Артыкул 62. Воінскія часці і вайсковыя злучэнні складаюць асобныя выбарчыя ўчасткі з колькасцю не менш 50 і не больш 1.500 выбаршчыкаў.

Артыкул 63. Пры больніцах, радзільных дамах, санаторыях, дамах інвалідаў з колькасцю выбаршчыкаў не менш 50 утвараюцца асобныя выбарчыя ўчасткі.

У больніцах з некалькімі карпусамі дапускаецца ўтварэнне выбарчых участкаў пры асобных карпусах пры наяўнасці ў кожным з іх не менш 50 выбаршчыкаў.

У больніцах і іншых лячэбных установах, дзе асобныя выбарчыя ўчасткі не арганізуюцца, дапускаецца прыём выбарчых бюлетэняў у саміх больніцах і лячэбных установах выдзеленымі членамі выбарчых камісій. У гэтых выпадках больніцы снабжаюцца асобнымі выбарчымі скрынкамі.

Артыкул 64. Судны з колькасцю выбаршчыкаў не менш 25, якія знаходзяцца ў плаванні ў дзень выбараў, могуць скласці асобныя выбарчыя ўчасткі, уваходзячыя ў выбарчыя акругі па месцу прыпіскі судна.

У выпадках, калі колькасць выбаршчыкаў на судне роўна норме насельніцтва для выбарчай акругі па выбарах у гарадскі або раённы ў гарадах Совет дэпутатаў працоўных, утвараецца асобная выбарчая акруга па выбарах у гарадскі або раённы Совет дэпутатаў працоўных па месцу прыпіскі судна.

Артыкул 65. У кожным выбарчым участку ствараецца Участковая выбарчая камісія, агульная па выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных.

Артыкул 66. Участковыя выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца ў гарадах гарадскімі Советамі дэпутатаў працоўных, а ў гарадах з раённым падзелам — раённымі Советамі дэпутатаў працоўных; у сельскіх мясцовасцях і пасёлках—раённымі Советамі дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 6—10 членаў не пазней, чым за 45 дзён да выбараў.

Артыкул 67. Участковая выбарчая камісія:

а) праводзіць па выбарчаму ўчастку прыём выбарчых бюлетэняў;

б) праводзіць падлік галасоў па кожнаму кандыдату ў дэпутаты абласнога, раённага, гарадскога, сельскага і пасялковага Совета дэпутатаў працоўных;

в) перадае пратакол галасавання ў адпаведную Акруговую выбарчую камісію, а ўсё справаводства — у гарадскі або раённы Совет дэпутатаў працоўных.

Раздзел VIII
Парадак выстаўлення кандыдатаў у дэпутаты

Артыкул 68. На падставе артыкула 116 Канстытуцыі БССР кандыдаты пры выбарах выстаўляюцца па выбарчых акругах.

Права выстаўлення кандыдатаў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных забяспечваецца ва грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных: комуністычнымі партыйнымі арганізацыямі, прафесіянальнымі саюзамі, кааператывамі, арганізацыямі моладзі, культурнымі таварыствамі і іншымі арганізацыямі, зарэгістрыраванымі ва ўстаноўленым законам парадку.

Артыкул 69. Права выстаўлення кандыдатаў ажыццяўляюць як цэнтральныя органы грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, так і іх рэспубліканскія, абласныя і раённыя органы, таксама як агульныя сходы рабочых і служачых па прадпрыемствах і ўстановах, чырвонаармейцаў—па воінскіх часцях, а таксама агульныя сходы сялян — па калгасах, рабочых і служачых саўгасаў — па саўгасах.

Артыкул 70. Кандыдаты ў дэпутаты не могуць быць членамі Акруговых, а таксама Участковых выбарчых камісій той акругі, дзе яны выстаўлены кандыдатамі ў дэпутаты.

Артыкул 71. Не пазней, чым за 35 дзён да выбараў, усе грамадскія арганізацыі або таварыствы працоўных, якія вылучаюць кандыдатаў у дэпутаты абласных і раённых Советаў дэпутатаў працоўных, абавязаны зарэгістрыраваць кандыдатаў у дэпутаты ў адпаведнай Акруговай выбарчай камісіі.

Артыкул 72. Не пазней, чым за 20 дзён да выбараў, усе грамадскія арганізацыі або таварыствы працоўных, якія вылучаюць кандыдатаў у дэпутаты гарадскіх Советаў, раённых Советаў у гарадах, сельскіх і пасялковых Советаў дэпутатаў працоўных, абавязаны зарэгістрыраваць кандыдатаў у дэпутаты ў адпаведнай Акруговай выбарчай камісіі.

Артыкул 73. Акруговыя выбарчыя камісіі абавязаны зарэгістрыраваць усіх кандыдатаў у дэпутаты, выстаўленых грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб выбарах.

Артыкул 74. Грамадская арганізацыя або таварыства працоўных, якія вылучаюць кандыдата ў дэпутаты, абавязаны прадставіць у адпаведную Акруговую выбарчую камісію наступныя дакументы:

а) пратакол схода або пасяджэння, вылучыўшага кандыдата ў дэпутаты, падпісаны членамі Прэзідыума з указаннем іх узросту, месцажыхарства, найменавання арганізацыі, вылучыўшай кандыдата, указання аб месцы, часе і колькасці ўдзельнікаў схода або пасяджэння, вылучыўшага кандыдата ў дэпутаты, прычым у пратаколе павінны быць указаны прозвішча, імя, імя па бацьку кандыдата ў дэпутаты, яго ўзрост, месцажыхарства, партыйнасць, занятак;

б) заява кандыдата ў дэпутаты аб яго згодзе балатыравацца па данай выбарчай акрузе ад выставіўшай яго арганізацыі.

Артыкул 75. Кандыдат у дэпутаты Совета дэпутатаў працоўных можа галасавацца ў адзін і той-жа Совет толькі ў адной акрузе.

Артыкул 76. Адмова Акруговай па выбарах у абласны, раённы, гарадскі, раённы ў гарадах, сельскі і пасялковы Совет дэпутатаў працоўных выбарчай камісіі ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты можа быць абскарджана ў двухдзённы тэрмін адпаведна ў Абласную, Раённую, Гарадскую, Раённую ў гарадах, Сельскую і Пасялковую выбарчую камісію, рашэнне якой з'яўляецца канчатковым.

Артыкул 77. Прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, занятак, партыйнасць кожнага зарэгістрыраванага кандыдата ў дэпутаты абласнога і раённага Советаў дэпутатаў працоўных і найменаванне грамадскай арганізацыі, вылучыўшай кандыдата, апублікоўваюцца адпаведнай Акруговай выбарчай камісіяй не пазней, чым за 30 дзён да выбараў.

Даныя аб зарэгістрыраваных Акруговымі камісіямі кандыдатах у дэпутаты гарадскога, раённага ў гарадах, сельскага і пасялковага Советаў дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца адпаведнай Гарадской, Раённай у гарадах, Сельскай і Пасялковай выбарчай камісіяй не пазней, чым за 15 дзён да выбараў.

Артыкул 78. Усе зарэгістрыраваныя кандыдаты ў дэпутаты Советаў дэпутатаў працоўных падлягаюць абавязковаму ўключэнню ў выбарчыя бюлетэні.

Артыкул 79. Акруговыя па выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі, а таксама Сельскія і Пасялковыя выбарчыя камісіі абавязаны разаслаць усім Участковым выбарчым камісіям выбарчыя бюлетэні не пазней, чым за 10 дзён да выбараў.

Артыкул 80. Выбарчыя бюлетэні друкуюцца на мовах насельніцтва адпаведнай выбарчай акругі.

Артыкул 81. Выбарчыя бюлетэні друкуюцца па форме, устаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР, і ў колькасці, якая забяспечвае снабжэнне ўсіх выбаршчыкаў выбарчымі бюлетэнямі.

Артыкул 82. Кожнай арганізацыі, выставіўшай кандыдата, зарэгістрыраванага ў адпаведнай выбарчай камісіі, таксама як кожнаму грамадзяніну БССР, забяспечваецца права бесперашкоднай агітацыі за гэтага кандыдата на сходах, у друку і іншымі спосабамі, згодна артыкула 100 Канстытуцыі БССР.

Раздзел IX
Дзень выбараў

Артыкул 83. Выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных праводзяцца на працягу аднаго дня—агульнага для БССР.

Артыкул 84. Дзень выбараў устанаўліваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР не пазней, чым за два месяцы да тэрміна выбараў. Выбары праводзяцца ў нерабочы дзень.

Артыкул 85. Штодзённа на працягу апошніх 15 дзён перад выбарамі Участковая выбарчая камісія шырока апавяшчае выбаршчыкаў шляхам апублікавання або іншым спосабам аб дні выбараў і месцы выбараў.

Раздзел X
Парадак галасавання

Артыкул 86. Падача галасоў выбаршчыкамі праводзіцца ў дзень выбараў ад 6 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы па мясцоваму часу.

Артыкул 87. У 6 гадзін раніцы ў дзень выбараў старшыня Участковай выбарчай камісіі ў прысутнасці яе членаў правярае выбарчыя скрынкі і наяўнасць складзенага па ўстаноўленай форме спіса выбаршчыкаў, пасля чаго закрывае і апячатвае скрынкі пячаткай камісіі і запрашае выбаршчыкаў прыступіць да падачы галасоў.

Узоры пячатак і выбарчых скрынак устанаўліваюцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР.

Артыкул 88. Кожны выбаршчык галасуе асабіста, з'яўляючыся для гэтага ў памяшканне для галасавання, прычым падача галасоў выбаршчыкамі праводзіцца шляхам апускання ў выбарчую скрынку выбарчых бюлетэняў.

Артыкул 89. У памяшканні для выбараў выдзяляецца для запаўнення бюлетэняў асобны пакой, у якім у часе галасавання забараняецца прысутнасць каго-б там ні было, у тым ліку і членаў Участковай выбарчай камісіі, апрача галасуючых; пры допуску ў пакой для запаўнення бюлетэняў адначасова некалькіх выбаршчыкаў, ён павінен быць абсталяваны перагародкамі або шырмамі, па ліку дапускаемых адначасова выбаршчыкаў.

Артыкул 90. Выбаршчык, які з'явіўся ў выбарчае памяшканне, прад'яўляе сакратару або члену Участковай выбарчай камісіі або пашпарт, або калгасную кніжку, або. прафсаюзны білет, або іншае пасведчанне асобы, і пасля праверкі па спісу выбаршчыкаў і адзнакі ў спісе выбаршчыкаў атрымлівае выбарчыя бюлетэні ўстаноўленага ўзору.

Артыкул 91. На асоб, якія з'явіліся ў памяшканне для выбараў з «пасведчаннем на права галасавання», згодна артыкула 20 гэтага Палажэння аб выбарах, Участковая выбарчая камісія вядзе асобны спіс, які прыкладаецца да спіса выбаршчыкаў.

Артыкул 92. Выбаршчык у пакоі, адведзеным для запаўнення выбарчых бюлетэняў, пакідае ў кожным выбарчым бюлетэні прозвішча таго кандыдата, за якога ён галасуе, выкрэсліваючы астатніх; пасля гэтага выбаршчык пераходзіць у пакой, дзе змяшчаецца Участковая выбарчая камісія, і апускае выбарчыя бюлетэні ў выбарчую скрынку.

Артыкул 93. Выбаршчыкі, якія не маюць магчымасці з прычыны непісьменнасці або якога-небудзь фізічнага недахопу самастойна запоўніць выбарчыя бюлетэні, маюць права запрасіць у пакой, дзе запаўняюцца выбарчыя бюлетэні, любога іншага выбаршчыка для запаўнення выбарчых бюлетэняў.

Артыкул 94. Выбарная агітацыя ў выбарчым памяшканні ў часе падачы галасоў не дапускаецца.

Артыкул 95. Адказнасць за парадак у выбарчым памяшканні нясе старшыня Участковай выбарчай камісіі і яго распараджэнні для ўсіх прысутных абавязковы.

Артыкул 96. У 12 гадзін ночы дня выбараў старшыня Участковай выбарчай камісіі аб'яўляе падачу галасоў закончанай, і камісія прыступае да ўскрыцця выбарчых скрынак.

Раздзел XI
Вызначэнне рэзультатаў выбараў

Артыкул 97. У памяшканні, дзе Участковая выбарчая камісія робіць падлік галасоў, пры падліку галасоў маюць права прысутнічаць спецыяльна на тое ўпаўнаважаныя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, а таксама прадстаўнікі друку.

Артыкул 98. Участковая выбарчая камісія, ускрыўшы скрынкі, падлічвае бюлетэні па акругах, звярае лік паданых бюлетэняў з лікам асоб, якія ўдзельнічалі ў галасаванні (на падставе адзнак у спісе выбаршчыкаў пры атрыманні бюлетэняў), і рэзультаты зверкі заносіць у пратаколы галасавання па кожнай выбарчай акрузе.

Артыкул 99. Старшыня Участковай выбарчай камісіі абвяшчае ў прысутнасці ўсіх членаў Участковай выбарчай камісіі рэзультаты галасавання па кожнаму бюлетэню.

Артыкул 100. Прызнаюцца несапраўднымі бюлетэні, у якіх пры галасаванні пакінута больш аднаго кандыдата, а таксама бюлетэні неўстаноўленага ўзору і колеру.

Артыкул 101. Пры ўзнікненні сумненняў у сапраўднасці выбарчага бюлетэня пытанне вырашаецца Участковай выбарчай камісіяй шляхам галасавання, што адзначаецца ў пратаколе.

Артыкул 102. Участковая выбарчая камісія складае па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па кожнай выбарчай акрузе пратакол галасавання ў двух экземплярах, падпісваемых усімі членамі Участковай выбарчай камісіі, у тым ліку абавязкова старшынёю і сакратаром.

Артыкул 103. У пратаколе галасавання Участковай выбарчай камісіі павінна быць указана:

а) час пачатку і сканчэння падачы галасоў;

б) лік выбаршчыкаў па выбарчаму ўчастку і па акругах;

в) лік выбаршчыкаў, падаўшых галасы па спісу выбаршчыкаў;

г) лік выбаршчыкаў, падаўшых галасы па «пасведчаннях на права галасавання»;

д) лік паданых бюлетэняў па выбарчаму ўчастку і па акругах;

е) кароткае ізлажэнне заяў і скарг, паданых ва Участковую выбарчую камісію і прынятыя Участковай выбарчай камісіяй рашэнні;

ж) рэзультаты падліку галасоў па кожнаму кандыдату.

Артыкул 104. Пасля сканчэння падліку галасоў і складання пратаколаў, старшыня Участковай камісіі абвяшчае рэзультаты галасавання па кожнай акрузе ў прысутнасці ўсіх членаў камісіі.

Артыкул 105. Адзін экземпляр пратакола галасавання, складзенага Участковай выбарчай камісіяй, накіроўваецца з нарочным на працягу 24 гадзін у адпаведную Акруговую выбарчую камісію.

Артыкул 106. Усе выбарчыя бюлетэні (асобна сапраўдныя і асобна прызнаныя несапраўднымі) павінны быць апячатаны пячаткай Участковай выбарчай камісіі і разам з другімі экземплярамі пратаколаў галасавання і пячаткай зданы старшынёю Участковай выбарчай камісіі на захоўванне: у гарадах — гарадскім Советам дэпутатаў працоўных, а ў гарадах з раённым падзелам—раённым Советам дэпутатаў працоўных; у сельскіх мясцовасцях і пасёлках—раённым Советам дэпутатаў працоўных.

Артыкул 107. На Советы дэпутатаў працоўных ускладаецца абавязак захоўваць выбарчыя бюлетэні аж да зацвярджэння мандатаў дэпутатаў ад кожнай акругі адпаведным Советам дэпутатаў працоўных.

Артыкул 108. Акруговыя па выбарах у абласны, раённы, гарадскі, раённы ў гарадах, сельскі і пасялковы Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўстанаўліваюць рэзультаты выбараў па акрузе на падставе пратаколаў, прадстаўленых Участковымі выбарчымі камісіямі.

Артыкул 109. У памяшканні, дзе Акруговая выбарчая камісія робіць падлік галасоў, маюць права прысутнічаць пры падліку галасоў спецыяльна на тое ўпаўнаважаныя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, а таксама прадстаўнікі друку.

Артыкул 110. Акруговая выбарчая камісія складае па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме пратакол галасавання ў 2-х экземплярах, падпісваемых усімі членамі Акруговай выбарчай камісіі, у тым ліку абавязкова старшынёю і сакратаром.

Артыкул 111. У пратаколе Акруговай выбарчай камісіі павінна быць указана:

а) агульны лік выбаршчыкаў па акрузе;

б) агульны лік выбаршчыкаў, прыняўшых удзел у галасаванні;

в) лік галасоў, паданых за кожнага кандыдата ў дэпутаты;

г) кароткае ізлажэнне заяў і скарг, паданых у Акруговую выбарчую камісію, і прынятыя Акруговай выбарчай камісіяй рашэнні.

Артыкул 112. Пасяджэнні выбарчых камісій па выбарах у Советы дэпутатаў працоўных лічацца сапраўднымі, калі на іх удзельнічае больш паловы агульнага састава камісіі.

Артыкул 113. Усе пытанні ў выбарчых камісіях вырашаюцца простай большасцю галасоў; пры роўнасці галасоў — голас старшыні дае перавагу.

Артыкул 114. Не пазней 24 гадзін пасля сканчэння падліку галасоў старшыня Акруговай выбарчай камісіі абавязан пераслаць пратакол у запячатаным выглядзе праз нарочнага ў адпаведную Абласную, Раённую, Гарадскую, Сельскую і Пасялковую выбарчую камісію.

Артыкул 115. Кандыдат у дэпутаты Совета дэпутатаў працоўных, які атрымаў абсалютную большасць галасоў, г. зн. больш паловы ўсіх галасоў, паданых па акрузе і прызнаных сапраўднымі, лічыцца выбраным.

Артыкул 116. Пасля падпісання пратакола старшыня Акруговай выбарчай камісіі абвяшчае рэзультаты выбараў і выдае выбранаму кандыдату ў дэпутаты пасведчанне аб выбранні. Форма пасведчання аб выбранні ўстанаўліваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР.

Артыкул 117. Калі ні адзін з кандыдатаў па акрузе не атрымаў абсалютнай большасці галасоў, адпаведная Акруговая выбарчая камісія адзначае аб гэтым асобна ў пратаколе і паведамляе ў Абласную, Раённую, Гарадскую, Раённую ў гарадах, Сельскую і Пасялковую выбарчую камісію і адначасова абвяшчае перабалатыроўку двух кандыдатаў, атрымаўшых найбольшую колькасць галасоў, а таксама назначае дзень перабалатыроўкі не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін пасля сканчэння першага тура выбараў.

Артыкул 118. Калі паданая колькасць галасоў па акрузе складае менш паловы выбаршчыкаў, маючых права галасаваць па гэтай акрузе, Акруговая выбарчая камісія адзначае аб гэтым асобна ў пратаколе і паведамляе неадкладна ў адпаведную Абласную, Раённую, Гарадскую, Раённую ў гарадах, Сельскую і Пасялковую выбарчую камісію, прычым у гэтым выпадку Абласная, Раённая, Гарадская, Раённая ў гарадах, Сельская і Пасялковая выбарчая камісія назначае новыя выбары не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін пасля першых выбараў.

Артыкул 119. Перабалатыроўка кандыдатаў у дэпутаты, таксама як новыя выбары ўзамен прызнаных несапраўднымі, праводзяцца па спісах выбаршчыкаў, складзеных для першых выбараў, і ў поўнай адпаведнасці з гэтым Палажэннем аб выбарах.

Раздзел XII
Адказнасць за нарушэнне выбарчых праваў грамадзян

Артыкул 120. Усякі, хто шляхам насілля, абману, пагроз, або подкупу будзе перашкаджаць грамадзяніну БССР у ажыццяўленні яго права выбіраць і быць выбраным у Советы дэпутатаў працоўных БССР, — караецца пазбаўленнем свабоды на тэрмін да двух год.

Артыкул 121. Службовая асоба Совета або член выбарчай камісіі, зрабіўшыя падробку выбарчых дакументаў або заведама няправільны падлік галасоў, — караюцца пазбаўленнем свабоды на тэрмін да трох год.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Л. ПАПКОЎ.

Пастанова Беластоцкага абласнога выканаўчага камітэта

АБ УТВАРЭННІ ВЫБАРЧЫХ АКРУГ ПА ВЫБАРАХ У АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ БЕЛАСТОЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

(Працяг. Пачатак на 1 стар.).

стоцкай, Грахоўскай, Грыгорыя Горкавых, Маставой, Крупскай да вул. Бернарскай; уздоўж вул. Бернарскай, Парыжскай Комуны, перасякаючы вул. Комсамольскую і далей на поўнач уздоўж Комсамольскай і Свердлоўскай, да палатна чыгункі, да левага берагу ракі Нёман і па леваму берагу на ўсход да мяжы горада.

ПА ГОРАДУ ЛОМЖЫ

Ломжынская Паўднёва-Ўсходняя выбарчая акруга № 15 з цэнтрам у горадзе Ломжы, у межах: Стары рынак, вул. Розы Люксембург, Камінтэрнаўская, Здроевая, Валадарскага, Школьная, Совецкая ад вугла Сялянскай уверх, вул. Шчорса, Інтэрнацыянальнай і Зялёнай Набярэжнай.

Ломжынская Паўночная выбарчая акруга № 16 з цэнтрам у горадзе Ломжы, у межах: вул. Карла Маркса, Наднарэўскай, Урыцкага, Залейскай, Канальнай, Остроўскага, Чапаева—чотны бок, Совецкая вуліца—нячотны бок да вугла Сялянскай, 1-е Сакавіка, Крупскай, Шпітальная, Фізкультурная, Свабода, плошча Пушкіна, вул. Горкага, Бочная, Фарная, Энгельса, Пролетарская, Вяткаўская, Чэрнышэўскага і 8-га сакавіка.

Ломжынская Заходняя выбарчая акруга № 17 з цэнтрам у горадзе Ломжы, у межах: вуліцы Чапаева—нячотны бок, Совецкая—чотныя за вугла Сялянскай, Кірава, Ломжыца, Агародная, Чырвонаармейская, 17-га верасня, па дарозе да Ломжыцы, вул. Ленінская, Кастрычніцкая, Садовая, Маякоўскага, Вонская, Дзержынскага, Гурная, Новая Сялянская, плошча Міцкевіча, шасе Міцкевіча, Заводская і Комсамольская.

ПА АЎГУСТОЎСКАМУ РАЁНУ

Аўгустоўская гарадская выбарчая акруга № 18 з цэнтрам у горадзе Аўгустове ў саставе насельніцтва цэнтра горада Аўгустова за выключэннем пасёлкаў: Ліпавец, Сталіна, Леніна, Молатава і прадмесця Выпусты.

Аўгустоўская сельская выбарчая акруга № 19 з цэнтрам у горадзе Аўгустове ў саставе населеных пунктаў: Ліпавец, Сталіна, вул. Свердлова, Молатава і прадмесця Выпусты і населеныя пункты Аўгустоўскага, Яноўскага і Бернадкоўскага сельсоветаў.

Барглоўская выбарчая акруга № 20, Аўгустоўскага раёна, з цэнтрам у сяле Барглова, у саставе населеных пунктаў: Памянскага, Вусцянскага, Барглоўскага, Крошэўскага, Вулькаўскага сельсоветаў.

Штабінская выбарчая акруга № 21, Аўгустоўскага раёна, з цэнтрам у сяле Штабіна, у саставе населеных пунктаў: Чырвонаармейскага, Штабінскага, Грабоўскага, Краснадарскага і Кольніцкага сельсоветаў.

ПА БЕЛАСТОЦКАМУ РАЁНУ

Беластокая сельская акруга № 22 з цэнтрам у пасёлку Хорашчы, у саставе населеных пунктаў: Ежаўскага сельсовета, Тыкоцінскага гарадскога пасялковага Совета і сельсоветаў: Тыкоцінскага, Харошчынскага і Златарыйскага.

Старасельская выбарчая акруга № 23 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Старасельцы ў саставе населеных пунктаў: Касцюкоўскага і Баршчоўскага сельсоветаў, Старасельскага гарадскога пасялковага Совета, Бацюкоўскага і Альмантоўскага сельсоветаў.

Бацечкаўская выбарчая акруга № 24 з цэнтрам у сяле Бацечкі, у саставе населеных пунктаў сельсоветаў: Копыскага, Летнікоўскага, Пагарэлкаўскага, Бацечкаўскага, Васількоўскага і Васількоўскага гарадскога пасялковага совета.

Супраслеўская выбарчая акруга № 25 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Супрасль, у саставе населеных пунктаў: Чарнавескага, Зялёнаўскага сельсоветаў, Чарнавескага пасялковага совета і Супраслеўскага гарадскога пасялковага совета.

ПА БРАНСКАМУ РАЁНУ

Карыцінская выбарчая акруга № 26 з цэнтрам у Карыціне ў саставе населеных пунктаў: Гродзіскага, Далабоўскага, Карыцінскага, Руткоўскага і Бароўскага сельсоветаў.

Бранская выбарчая акруга № 27 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Бранск, у саставе населеных пунктаў: Бранскага гарадскога пасялковага совета, Алексінскага, Кольніцкага і Малешэўскага сельсоветаў.

Пякуцкая выбарчая акруга № 28 з цэнтрам у сяле Пякуты, ў саставе населеных пунктаў: Даманаўскага, Кастрынскага, Пякуцкага, Тапчэўскага і Вышноўскага сельсоветаў.

ПА БЕЛЬСКАМУ РАЁНУ

Бельская выбарчая акруга № 29 з цэнтрам у горадзе Бельску, у саставе населеных пунктаў: Бельскага горсовета, Галадоўскага і Арэлянскага сельсоветаў.

Гацькаўская выбарчая акруга № 30 з цэнтрам у вёсцы Гацькі, у саставе населеных пунктаў: Клёнікаўскага, Кнаразоўскага, Гацькаўскага, Мулявіцкага і Аўгустоўскага сельсоветаў.

Боцькаўская выбарчая акруга № 31 з цэнтрам у мястэчку Боцькі, у саставе населеных пунктаў: Стрыкоўскага, Пілікоўскага, Дубяжынскага, Андрыянаўскага і Боцькаўскага сельсоветаў.

ПА ВАЎКАВЫСКАМУ РАЁНУ

Ваўкавыская сельская выбарчая акруга № 32 з цэнтрам у горадзе Ваўкавыску, у саставе населеных пунктаў: гор. Ваўкавыск—вул. Карла Маркса, Чыстая, Віленская, Мопраўская, Усходняя, Совецкая ад № 60 да сканчэння, Жвіркі—Вігуры, Доўгая да цагельнага завода № 5, Заполле, Крынічная, Сялянская, Першамайская, Дзержынскага, Ізабелінскага, Бачанскага і Біскупіцкага сельсоветаў.

Ваўкавыская гарадская выбарчая акруга № 33 з цэнтрам у горадзе Ваўкавыску, у саставе насельніцтва горада без вуліц, якія ўваходзяць у сельскую выбарчую акругу.

Шылсвіцкая выбарчая акруга № 34 з цэнтрам у в. Шыловічы ў саставе населеных пунктаў: Янышэўскага, Мсцібоўскага, Шыловіцкага, Тальноўскага і Дзевяткаўскага сельсоветаў.

Чырвонасельская выбарчая акруга № 35 з цэнтрам у вёсцы Чырвонаселле, у саставе населеных пунктаў: Варыноўскага, Дыхнавіцкага, Чырвонасельскага, Лічыдскага, Воблаўскага, Валпянскага і Бурнеўскага сельсоветаў.

Роская выбарчая акруга № 36 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Рось, у саставе населеных пунктаў: Гудзевіцкага, Остроўскага, Валпянскага, Тупічанскага, Роскага і Масевіцкага сельсоветаў.

ПА ГРАЕЎСКАМУ РАЁНУ

Шчучынская выбарчая акруга № 37 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Шчучын, у саставе населеных пунктаў: Нечкаўскага, Абрыдскага, Шчучынскага, Жабраўскага сельсоветаў, Кажадзінскага і Шчучынскага гарадскіх пасёлкаў.

Рудская выбарчая акруга № 38 з цэнтрам у в. Руды, у саставе населеных пунктаў: Пшэходскага, Бялашэўскага, Асавецкага, Вяжбоўскага і Рудскага сельсоветаў.

Граеўская выбарчая акруга № 39 з цэнтрам у гор. Граеве ў саставе: гор. Граева, Папоўскага, Бачкоўскага і Граеўскага сельсоветаў.

Белдаўская выбарчая акруга № 40 з цэнтрам у в. Белды, у саставе населеных пунктаў: Мечанскага, Шыманскага, Белдаўскага, Цішаўскага сельсоветаў і Райгарадскага гарадскога пасёлка.

ПА ГРОДНЕНСКАМУ РАЁНУ

Індурская выбарчая акруга № 41 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Індура, у саставе населеных пунктаў: гарадскога пасёлка Індура і сельсоветаў: Індурскага, Варашылаўскага, Навасёлкаўскага.

Багушэўская выбарчая акруга № 42 з цэнтрам у вёсцы Багушэўцы, у саставе населеных пунктаў: Грондзіцкага, Годанскага, Багушэўскага, Верцялішскага і Путрышскага сельсоветаў.

Кузнецкая выбарчая акруга № 43 з цэнтрам у мястэчку Кузніца ў саставе населеных пунктаў: Кузніцкага, Ваўкушанскага, Падлінскага, Брузгінскага і Старадубскага сельсоветаў.

Капцёўская выбарчая акруга № 44 з цэнтрам у вёсцы Капцёўка, у саставе населеных пунктаў: Гібулінескага, Жукевіцкага, Капцёўскага і Агародніцкага сельсоветаў.

ПА ДАМБРАЎСКАМУ РАЁНУ

Сухавольская выбарчая акруга № 45 з цэнтрам у мястэчку Сухаволле, у саставе населеных пунктаў: Сухавольскага гарадскога пасёлка, Сухавольскага, Карсноўскага, Чарноўскага і Старaходараўскага сельсоветаў.

Дамбраўская выбарчая акруга № 46 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Дамбрава, у саставе населеных пунктаў: Дамбраўскага гарадскога пасёлка, Кудраўшчызненскага, Остроўскага і Круглянскага сельсоветаў.

Навадворская выбарчая акруга № 47 з цэнтрам у вёсцы Новы Двор, у саставе населеных пунктаў: Навадворскага, Макаўлянскага, Сідранскага, Серуцёўскага, Бялянскага і Залескага сельсоветаў.

ЕДВАБНАЎСКІ РАЁН

Едвабнаўская выбарчая акруга № 48 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Едвабна, у саставе населеных пунктаў: Едвабнаўскага гарадскога пасёлка, Бажнеўскага, Візненскага, Рудкоўскага і Занклеўскага сельсоветаў.

Пшытульская выбарчая акруга № 49 з цэнтрам у вёсцы Пшытулы, у саставе населеных пунктаў: Пшытульскага, Вагенскага, Сестшанскага, Касакоўскага і Пшэстшэльскага сельсоветаў.

Радзілаўская выбарчая акруга № 50 з цэнтрам у мястэчку Радзілаў, у саставе населеных пунктаў: Радзілаўскага, Бароўскага, Лаўскага, Лос-Авісаўскага і Раманаўскага сельсоветаў.

ЗАМБРАЎСКІ РАЁН

Замбраўская выбарчая акруга № 51 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Замбрава, у саставе населеных пунктаў: Замбраўскага гарадскога пасёлка, Воля-Замбраўскага, Длугабожскага і Стара-Закшэўскага сельсоветаў.

Руткоўская выбарчая акруга № 52 з цэнтрам у вёсцы Руткі, у саставе населеных пунктаў: Руткоўскага, Каленчынскага, Шляса-Ляпеніцкага, Вяліка-Прушкоўскага, Менжынскага, Цібора-Палецкага, Хлебаткоўскага і Заводскага сельсоветаў.

Калацкая выбарчая акруга № 53 з цэнтрам у вёсцы Калакі, у саставе населеных пунктаў: Калацкага, Куляшоўскага, Каліноўскага, Пухальскага, Выгодскага і Шэдрухскага сельсоветаў.

ЗАБЛУДАЎСКІ РАЁН

Міхайлаўская выбарчая акруга № 54 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Міхалава, у саставе населеных пунктаў: гарадскіх пасёлкаў Міхайлаўскага і Гарадоцкага, Валілаўскага, Каралева-Мастоцкага і Міхайлаўскага сельсоветаў.

Рыболская выбарчая акруга № 55, Заблудаўскага раёна, з цэнтрам у вёсцы Рыболы, у саставе населеных пунктаў: Юхнавецкага, Дарожкаўскага, Рыболскага, Басонскага і Астравецкага сельсоветаў.

Заблудаўская выбарчая акруга № 56 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Заблудава, у саставе населеных пунктаў: Рафалоўскага, Тыльвіцкага, Агародніцкага, Тапалянскага сельсоветаў і гарадскога пасёлка Заблудава.

КОЛЬНАЎСКІ РАЁН

Кольнаўская выбарчая акруга № 57 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Кольна, у саставе населеных пунктаў: Контаўскага, Забельскага, Лосеўскага, Чэрвеньскага сельсоветаў і гарадскога пасёлка Кольна.

Ставіская выбарчая акруга № 58 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Ставіскі, у саставе населеных пунктаў: Баркоўскага, Малаплоцкага, Парыта-Васнянскага, Расткоўскага сельсоветаў і гарадскога пасёлка Ставіскі.

Ляхаўская выбарчая акруга № 59 з цэнтрам у вёсцы Ляхава, у саставе населеных пунктаў: Скрадоўскага, Грабоўскага, Сурольскага, Кумельскага, Ляхаўскага, Акураўскага і Міхноўскага сельсоветаў.

КРЫНКАЎСКІ РАЁН

Крынкаўская выбарчая акруга № 60 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Крынкі, у саставе населеных пунктаў: Крынкаўскага, Крушнянскага, Гуранскага сельсоветаў і гарадскога пасёлка Крынкі.

Алекшыцкая выбарчая акруга № 61 з цэнтрам у вёсцы Алекшыцы, у саставе населеных пунктаў: Макаравецкага, Глабовіцкага, Іоцкаўскага, Эйсмантаўскага сельсоветаў.

Вяліка-Берастaвіцкая выбарчая акруга № 62 з цэнтрам у вёсцы Вялікія Берастaвіцы, у саставе населеных пунктаў: Данілкаўскага, Вяліка-Берастaвіцкага, Галынкаўскага і Мала-Берастaвіцкага сельсоветаў.

КНЫШЫНСКІ РАЁН

Ясвільская выбарчая акруга № 63 з цэнтрам у сяле Ясвілы, у саставе населеных пунктаў: Ясвільскага, Далістоўскага і Беласукнянскага сельсоветаў.

Кнышынская выбарчая акруга № 64 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Кнышын, у саставе населеных пунктаў: Кнышынскага гарадскога пасёлка, Ясіноўскага, Каліноўскага, Крэплянскага і Грондаўскага сельсоветаў.

Гонендская выбарчая акруга № 65 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Гонендз, у саставе населеных пунктаў: Доўнарскага і Монькаўскага сельсоветаў.

Трэсцянская выбарчая акруга № 66 з цэнтрам у сяле Трэсцяны, у саставе населеных пунктаў: Трэсцянскага, Хайноўскага, Вішнявіцкага, Лясковецкага, Длугаленскага і Багушэвіцкага сельсоветаў.

ПА ЛАПСКАМУ РАЁНУ

Суражская выбарчая акруга № 67 з цэнтрам у вёсцы Сураж, у саставе населеных пунктаў: Туросенскага, Рыльскага, Суражскага, Олексінскага і Пасвянтоўскага сельсоветаў.

Лапская выбарчая акруга № 68 з цэнтрам у горадзе Лапы, у саставе населеных пунктаў: горад Лапы, Лупянскага і Гонсаўскага сельсоветаў.

Сакольская выбарчая акруга № 69 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Саколы, у саставе населеных пунктаў: Сакольскага гарадскога пасялковага Совета, Сакольскага, Ежаўскага і Яблонскага сельсоветаў.

Бажымская выбарчая акруга № 70 з цэнтрам у вёсцы К. Бажымы, у саставе населеных пунктаў: Стара-Рускага, Бажымскага, Пшчэльчынскага, Кружэўскага і Вnораўскага сельскіх советаў.

ПА ЛОМЖЫНСКАМУ РАЁНУ

Пятніцкая выбарчая акруга № 71 з цэнтрам у вёсцы Пятніца, у саставе населеных пунктаў: Роглеўніцкага, Драздоўскага, Пятніцкага, Каўнатоўскага, Кісельніцкага і Высокадужаўскага сельсоветаў.

Мясткоўская выбарчая акруга № 72 з цэнтрам у вёсцы Мясткове, у саставе населеных пунктаў: Купіскага, Навагрудскага, Гжымала-Шчапанкоўскага, Мясткоўскага, Шчапанаўскага, Хмелеўскага і Гольчынскага сельсоветаў.

ПА ПАРЭЦКАМУ РАЁНУ

Парэцкая выбарчая акруга № 73 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Парэчча, у саставе населеных пунктаў гэтага раёна.

ПА СНЯДАЎСКАМУ РАЁНУ

Снядаўская выбарчая акруга № 74 з цэнтрам у пасёлку Снядава, у саставе населеных пунктаў: Клячкоўскага, Каплінскага, Менжынскага і Стара-Якоцкага сельсоветаў і пасёлка Снядава.

Шумаўская выбарчая акруга № 75 з цэнтрам у вёсцы Шумава, у саставе населеных пунктаў: Стара-Якоцкага, Шумаўскага, Серабрынскага, Падбельскага і Сулецінскага сельсоветаў.

Піскоўская выбарчая акруга № 76 з цэнтрам у вёсцы Піскі, у саставе населеных пунктаў: Піскаўскага, Жохаўскага, Трошынскага, Развборскага і Любоцінскага сельсоветаў.

ПА САКОЛКАЎСКАМУ РАЁНУ

Шудзялаўская выбарчая акруга № 77 з цэнтрам у мястэчку Шудзялава, у саставе населеных пунктаў: Шудзялаўскага, Бабіноўскага, Дуэльскага, Вярхлескага, Сакалдзенскага, Драгілеўскага сельсоветаў.

Саколкаўская выбарчая акруга № 78 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Саколка, у саставе населеных пунктаў: Саколкаўскага, Сакалянскага, Янаўшчызенскага, Бахматаўскага, Новавольскага сельсоветаў.

Янаўская выбарчая акруга № 79 з цэнтрам у мястэчку Янаўка, у саставе населеных пунктаў: Янаўскага, Куплінскага, Цеалінскага, Карыцінскага, Шацілаўскага і Зрацкага сельсоветаў.

ПА САПОЦКІНСКАМУ РАЁНУ

Сапоцкінская выбарчая акруга № 80 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Сапоцкіна, у саставе населеных пунктаў: Сапоцкінскага гарадскога пасялковага Совета, Соніцкага, Нежыкаўскага, Сельвановіцкага, Вяліка-Свяцкага, Латкаўскага, Багатырскага і Старскага сельсоветаў.

Рыгалоўская выбарчая акруга № 81 з цэнтрам у вёсцы Рыгалоўка, у саставе населеных пунктаў Галынкаўскага, Ліпскага, Рыгалеўскага, Польна-Багатырскага, Наумавіцкага і Баранавіцкага сельсоветаў.

ПА СВІСЛАЦКАМУ РАЁНУ

Свіслацкая выбарчая акруга № 82 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Свіслач, у саставе населеных пунктаў: Свіслацкага гарадскога пасялковага Совета і Свіслацкага сельсовета, Відзейкаўскага, Кватэрскага і Грыцавіцкага сельсоветаў.

Вяліка - Грынкаўская выбарчая акруга № 83 з цэнтрам у вёсцы В. Грынкі, у саставе населеных пунктаў: Вяліка-Сельскага, Агародніцкага, Вяліка-Грынкаўскага, Дабравольскага, Незбадзіцкага, Ялоўскага і Палонкаўскага сельсоветаў.

Лукаўская выбарчая акруга № 84 з цэнтрам у вёсцы Лука, у саставе населеных пунктаў: Мастаўлянскага, Выкоўскага, Шымскага, Юшкава-Грудскага, Лукаўскага і Стара-Леўкаўскага сельсоветаў.

ПА СКІДЭЛЬСКАМУ РАЁНУ

Лунінская выбарчая акруга № 85 з цэнтрам у пасёлку Лунны, у саставе населеных пунктаў: Лунінскага пасялковага Совета, Жыліцкага, Лунінскага, Дубноўскага і Русіноўскага сельсоветаў.

Скідэльская выбарчая акруга № 86 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Скідэль у саставе населеных пунктаў: Скідэльскага гарадскога пасялковага Совета, Скідэльскага, Лоўненскага і Абухаўскага сельсоветаў.

Азёрская выбарчая акруга № 87 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Азёры, у саставе населеных пунктаў: Азёрскага гарадскога пасялковага Совета, Азёрскага, Жытамлянскага, Стралецкага і Глінянскага сельсоветаў.

ПА ЦЭХАНАВЕЦКАМУ РАЁНУ

Цэханавецкая выбарчая акруга № 88 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Цэханавец, у саставе населеных пунктаў: Цэханавецкага гарадскога пасялковага Совета, Кучынскага, Вышанкоўскага, Войнаўскага і Кшакоўскага сельсоветаў.

Творага-Лядская выбарчая акруга № 89 з цэнтрам у сяле Творага-Лядску, у саставе населеных пунктаў: Касяркоўскага, Пярлоўскага, Творага-Лядскага, Пабікроўскага і Войнаўскага сельсоветаў.

Багуцкая выбарчая акруга № 90 з цэнтрам у вёсцы Багуты, у саставе населеных пунктаў: Багуцкага, Галындскага, Нурскага і Запкоўскага сельсоветаў.

ПА ЧЫЖАЎСКАМУ РАЁНУ

Вяліка-Дамбраўская выбарчая акруга № 91 з цэнтрам у Вяліка-Дамбраўску, у саставе населеных пунктаў: Вяліка-Дамброўскага, Высока-Мазавецкага, Шапятоўскага, Свенскага, Дамбраўскага і Расахацкага сельсоветаў.

Чыжаўская выбарчая акруга № 92 з цэнтрам у гарадскім пасёлку Чыжаў, у саставе населеных пунктаў: Чыжаўскага гарадскога пасялковага Совета, Шульбарскага, Мянюўскага, Мрачкоўскага, Андрэеўскага і Чыжаўскага сельсоветаў.

Зарэмбаўская выбарчая акруга № 93 з цэнтрам у вёсцы Зарэмбы-Касцельны, у саставе населеных пунктаў: Зарэмбаўскага, Пянткоўскага, Ясеніцкага, Калечыцкага, Папроцкага, Канчалскага і Калінскага сельсоветаў.

Старшыня Беластоцкага аблвыканкома С. МАЛЬЦАЎ.

Сакратар Беластоцкага аблвыканкома П. ЗУБОВІЧ.

гор. Беласток, 16 кастрычніка 1940 года.

Абвяржэнне ТАСС

1. Японская газета «Хоці» ад 16 кастрычніка г. г. паведамляе, што «урад СССР рашыў склікаць у Маскве канферэнцыю чатырох дзяржаў: СССР, Японіі, Германіі і Італіі».

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэта паведамленне не адпавядае сапраўднасці.

2. Англійскія газеты «Ньюс кронікл», «Дэйлі геральд», «Дэйлі экспрэс» апублікавалі паведамленне агенцтва Рэйтэр, быццам совецкія войскі ўступілі ў Румынію, а ў Чорным моры совецкі мінаносец патапіў румынскі карабль. Турэцкія газеты, якія выдаюцца ў Стамбуле, змясцілі 16 кастрычніка паведамленне з Лондана, быццам паблізу Галаца адбылася сутычка паміж совецкімі і германскімі часцямі.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што ўсе вышэйпаданыя паведамленні пазбаўлены якога-бы та ні была аснавання.

—«о»—

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 18 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе:

«У выхада Брыстольскага заліва адбыўся бой паміж германскімі эсмінцамі і англійскімі крэйсерамі, якія ішлі ў суправаджэнні эсмінцаў. Адна тарпеда папала ў англійскі карабль. Услед за гэтым непрыяцель спыніў бой. Германскія эсмінцы без пашкоджанняў звярнуліся на свае базы.

Адна германская падводная лодка патапіла за апошні рэйд рад непрыяцельскіх суднаў.

Эскадрыллі лёгкіх бамбардыроўшчыкаў зноў зрабілі налёт на Лондан і гарады ў Паўднёва-Усходняй Англіі. Знішчаны ваенныя аб'екты ва ўсходняй частцы Лондана, паблізу докаў Вікторыя і ў раёне паўночнее Тэмзы.

Германская берагавая артылерыя абстраляла ля Гаўра непрыяцельскую падводную лодку. Затым пікіруючыя бамбардыроўшчыкі атакавалі яе. Неўзабаве на паверхні вады можна было заўважыць абломкі лодкі.

Германская берагавая артылерыя адкрыла агонь па непрыяцельскіх тарпедных катэрах, якія прабавалі наблізіцца да ўзбярэжжа Бельгіі, і прымусіла іх павярнуць назад.

Затым германская берагавая артылерыя абстраляла порт Дуўр, у якім знаходзілася многа англійскіх суднаў.

Уночы германская авіяцыя бамбардыравала прамысловыя збудаванні і докі Лондана, а таксама Ліверпуль і Бірмінгам.

Англійскія самалёты не заляталі ўчора на тэрыторыю Германіі. У час паветраных баёў непрыяцель страціў учора 17 самалётаў. Сем германскіх самалётаў не звярнуліся на свае базы».

БЕРЛІН, 18 кастрычніка. Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што ўвечары 17 кастрычніка і ў ноч на 18 кастрычніка англійская авіяцыя прадпрыняла 8 налётаў на французскае ўзбярэжжа Ла-Манша. Германская зенітная артылерыя адкрыла па іх эфектыўны агонь. Англійскія самалёты павярнулі назад, не скінуўшы бомб.

БЕРЛІН, 18 кастрычніка. Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, за тыдзень з 6 па 12 кастрычніка англійская авіяцыя страціла 105 самалётаў і 143 пілотаў, германская — 32 самалёты і 61 пілота.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 18 кастрычніка .(ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора непрыяцель прадпрыняў некалькі атак супроць паўднёва-ўсходняй часткі Англіі. Толькі нямногім самалётам удалося прарвацца да раёна Лондана. Прычыненыя бамбардыроўкай страты і колькасць ахвяр нязначныя. Невялікія шкоды прычынены ў некалькіх пунктах Паўднёвай часткі Англіі. Знішчана 4 непрыяцельскіх самалёты. Англійская авіяцыя страціла 4 знішчальніка.

У ноч на 18 кастрычніка атакі самалётаў праціўніка былі зноў накіраваны галоўным чынам супроць Лондана. Некалькі бомб скінуты на горад у Цэнтральнай Англіі і ў раёне ракі Мерсей. У Лондане і прамесцях разбурана некалькі будынкаў. У горадзе Цэнтральнай Англіі і ў раёне ракі Мерсей ёсць забітыя і раненыя. Пашкоджаныя і месцамі разбураны жылыя дамы. Узнікшыя пажары былі хутка ліквідаваны.

Нам. адказнага рэдактара Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага жыцця—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ — 75. Тыраж—10.000 экз. Друкарня Беластокдрук.